МИНИСТЕРСТВО СПОРТА И ТУРИЗМА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ

# ИННОВАЦИОННЫЕ ПРОЦЕССЫ В ФИЗКУЛЬТУРНОМ ОБРАЗОВАНИИ: ОПЫТ, ПРОБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТИВЫ

**Материалы**
**II Международной научно-методической конференции**
**20 января 2005 г., Минск**



# ІДЭІ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ГІСТОРЫІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

*Болбас В. С. (МазДПУ)*

Пытанні ідэйна-патрыятычнага, грамадзянскага выхавання ва ўсе часы былі прыярытэтнымі для дзяржавы. Значная ўвага ў іх распрацоўцы ўдзялялася ў нашай рэспубліцы ў савецкі перыяд. Пасля распаду СССР патрыятычнае выхаванне на некаторы перыяд не толькі страціла актуальнасць, а і аказалася незаслужана забытым. У апошнія гады цікавасць да яго няўхільна расце. Прычым, як справядліва падкрэсліваецца і вучонымі, і дзяржаўнымі дзеячамі, патрыятычнае выхаванне як ніякае іншае павінна будавацца на шматвяковым вопыце і напрацоўках айчыннай тэорыі і практыкі. Істотную каштоўнасць уяўляе спадчына мінулых стагоддзяў, бо абагульненыя ідэі нашых продкаў у справе патрыятычнага і грамадзянскага выхавання іграюць менталеўтвараючую ролю і сёння павінны разглядацца як вартасныя духоўныя арыентацыі, якія выпрабаваны жыццём і часам, таму яны павінны быць пакладзены ў падмурак сучаснага выхаваўчага працэсу.

Без апоры на маральна-духоўныя набыткі папярэдніх пакаленняў сфарміраваць такія якасці ў сучаснай моладзі немагчыма.

Асаблівую цікавасць выклікае перыяд XVI-XVII стст., калі завяршаецца працэс фарміравання беларускай народнасці і абвяшчаюцца радыкальныя пераўтварэнні ў жыцці грамадства. У гэты час само паняцце "Айчына" уводзіцца Ф. Скарынай у філасофска-педагагічную думку Беларусі. Сутнаснае напаўненне паняцця патрыятызму набывае шэраг асаблівасцей, якія актуальны і ў наш час:

1. Патрыятычныя пачуцці з'яўляюцца вызначальнымі для беларусаў, па іх вымяраецца ўвесь сэнс жыцця.

2. Патрыятызм у беларускага народа носіць лірычны адценак, тут адсутнічаюць ваяўнічасць, помслівасць. На першы план вылучаюцца дружалюбнасць, міралюбнасць.

3. Прыярытэтнае месца ў патрыятычных памкненнях займаюць любоў да "роднага кутка" – малой радзімы і адпаведныя адносіны да жывой і нежывой прыроды.

4. Любоў да сваёй радзімы і яе народа не пераходзіць у беларусаў у фанабэрыстасць, пагарду да іншых народаў.

5. Патрыятычным пачуццям беларусаў не ў такой ступені, як заходнееўрапейцам уласцівы індывідуалізм, тут пераважае калектывісцкая, абшчынная арыентацыя.

6. У айчыннай этыка-педагагічнай думцы эпохі Адраджэння рабілася выснова, што патрыятызм павінен мець дзейнасна-арыентаваны характар і вымярацца рэальным служэннем свайму народу і дзяржаве.